# У НАС НОВЫЯ КАЛЕГІ

**Да ўвагі калектыву Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. 18 кастрычніка 2024 года рашэннем Прэзідыума СПБ у рэспубліканскую пісьменніцкую арганізацыю прыняты два прадстаўнікі Гродзенскай вобласці. Імі сталі краязнаўца, публіцыст са Смаргоні Галіна Антонава і паэт з Ліды Руслан Піваварaў.**

Галіна Францішкаўна Антонава нарадзілася ў 1977 годзе ў в. Сасноўка Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працуе карэспандэнтам газеты «Светлы шлях» (Смаргонь). Аўтар кніг публіцыстыкі «Дзяруга», «Самародкі», «Месца пад сонцам» і іншых.



*Галіна Францішкаўна Антонава*

---

***

Руслан Анатольевіч Піваварaў нарадзіўся ў 1972 годзе ў г. Новамаскоўску Днепрапятроўскай вобласці (Украіна). Атрымаў сярэднюю адукацыю. Працаваў на розных прадпрыемствах, цяпер – на Мінойтаўскім рамонтным заводзе. Аўтар кніг паэзіі «О жизнь, тебя я прославляю!», «Тропою времён», «Свой крест», казкі ў вершах «О царь-девице Наталье» і іншых.



*Руслан Анатольевіч Піваварaў*

*Газета «Літаратура і мастацтва» № 41 (5302) 25 кастрычніка 2024 года*

_________